# СПРЭЧНАЕ ПЫТАННЕ КОШТУ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

У мэтах урэгулявання гэтых пытанняў і забеспячэння завяршэння прыватызацыі жылых памяшканняў у тэрміны, устаноўленыя кіраўніком дзяржавы, указам прадугледжваецца прадастаўленне грамадзяніну магчымасці самастойна звярнуцца ў арганізацыю, якая ажыццяўляе ацэначную дзейнасць, для правядзення за свой кошт незалежнай ацэнкі рыначнага кошту жылога памяшкання, што прыватызуецца.

Прадугледжаны прадаўжэнне тэрміну ажыццяўлення адміністрацыйнай працэдуры па прыватызацыі жылога памяшкання ў выпадку правядзення такой ацэнкі на адзін месяц (да двух месяцаў); прыватызацыя жылога памяшкання па найменшым кошце (рыначным або ацэначным).

Акрамя таго, прадугледжваецца выключэнне з кошту жылля, што прыватызуецца, дакументальна пацверджаных затрат грамадзяніна на аплату паслуг па правядзенні незалежнай ацэнкі рыначнага кошту жылога памяшкання (у выпадку прыватызацыі жылога памяшкання па рыначным кошце) і пакрыццё гэтых затрат у бюджэт арганізацыяй — балансатрымальнікам названага памяшкання.

Указ павінен спрасціць працэдуру вызначэння рэальнага кошту жылых памяшканняў, што прыватызуюцца грамадзянамі, і знізіць расходы мясцовых бюджэтаў на гэтыя мэты.

Дакумент уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

# ПАМЯЦІ ПЕСНЯРА



Фота БЕЛТА.

**Уладзімір МУЛЯВІН стварыў адзін з найбольш вядомых культурных брэндаў Беларусі. Учора на Усходніх могілках адбыўся мітынг да 75-годдзя з дня нараджэння мастацкага кіраўніка ансамбля «Песняры» і гадавіны з дня яго смерці.**
***На здымку:*** **кветкі ўскладае міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ.**

# ЗАЦВЕРДЖАНЫ РЭСПУБЛІКАНСКІ ПЛАН ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГОДА КУЛЬТУРЫ

**У плане згаданыя розныя конкурсы, фестывалі, форумы і г.д. На працягу 2016 года запланавана правядзенне акцый «Культурная сталіца Беларусі» і «Мецэнат культуры ў Год культуры», рэспубліканскіх конкурсаў — «Горад культуры ў Год культуры» (найбольш паспяховы турыстычны цэнтр) і «Чалавек Года культуры» (сярод работнікаў гэтай сферы ). Вынікі рэспубліканскіх конкурсаў будуць падведзены ў пачатку 2017 года.**

Працягнецца мадэрнізацыя і ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў культуры, у тым ліку ідзе гаворка аб завяршэнні рэканструкцыі комплексу будынкаў і збудаванняў Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм», аб завяршэнні капітальнага рамонту і рэканструкцыі памяшканняў рэгіянальных устаноў культуры. Працягнецца стварэнне Музейнага квартала ў Мінску на базе Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі (будаўніцтва плануецца завяршыць у 2018 годзе).

Акрамя таго, у 2016 годзе будуць рэалізаваны мерапрыемствы па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны. У прыватнасці, плануецца завяршэнне першай чаргі рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ у касцёле Божага Цела ў Нясвіжы і заканчэнне рэканструкцыі з рэстаўрацыяй помніка архітэктуры XVIII стагоддзя — Свята-Пакроўскага манастыра ў Талачыне. Пройдуць Дні еўрапейскай спадчыны, у рэпрэзентатыўны Спіс нематэрыяльнай спадчыны ЮНЕСКА будзе прадстаўлена дасье «Святкаванне ў гонар іконы Маці Божай Будслаўскай».

У чэрвені па традыцыі пройдзе Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур, у ліпені — свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў»), у жніўні-верасні — міжнародны фестываль этнакультурных традыцый «Кліч Палесся», у снежні — канферэнцыя «Другія Беларускія Калядныя чытанні». У плане — міжнародная акцыя «Ноч музеяў» (май) і III Нацыянальны форум «Музеі Беларусі» (верасень-кастрычнік). У маі-чэрвені таксама пройдуць XIV Свята мастацтваў «Мірскі замак» і фестываль «Музычныя вечары ў замках Беларусі».

Плануецца ўручыць Нацыянальную тэатральную, літаратурную і музычную (у галіне эстраднага мастацтва) прэміі. У ліпені пройдзе юбілейны XXV Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», у сакавіку — міжнародны маладзёжны тэатральны форум «M.art. Кантакт», у маі — Міжнародны фестываль тэатраў лялек, у чэрвені — XVI Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі, у верасні — міжнародны тэатральны фестываль «Белая вежа», у верасні-кастрычніку — форум тэатральнага мастацтва «ТэАрт», у кастрычніку — XI Міжнародны фестываль Юрыя Башмета, у лістападзе — XXIII Міжнародны кінафестываль «Лістапад».

У цэлым у плане прапісана правядзенне фестываляў, конкурсаў, выстаў, форумаў, накіраваных на развіццё і папулярызацыю музычнага, харэаграфічнага, выяўленчага, тэатральнага і кінамастацтва. Гэта, апроч іншага, прадугледжвае правядзенне Дзён культуры, Дзён кіно Беларусі за мяжой і мерапрыемстваў у адказ у Беларусі.

Асобна ў 2016 годзе будуць арганізаваны мерапрыемствы, прысвечаныя юбілярам — выдатным асобам беларускай культуры. Яны прымеркаваны да 140-годдзя з дня нараджэння Алаізы Пашкевіч, 125-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча, 120-годдзя з дня нараджэння Кандрата Крапівы, 95-годдзя з дня нараджэння Івана Шамякіна і Івана Мележа, 75-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Мулявіна.

На 3-4 верасня намечана святкаванне Дня беларускага пісьменства. У лютым-верасні адбудзецца дабрачынны творчы марафон «Адраджэнне», прымеркаваны да 30-й гадавіны аварыі на Чарнобыльскай АЭС. У чэрвені будуць арганізаваны мерапрыемствы да 75-й гадавіны пачатку Вялікай Айчыннай вайны. У снежні адбудзецца форум творчай інтэлігенцыі і работнікаў культуры.

# БЯСПЛАТНЫ ІНТЭРНЭТ І «КУЛЬТУРНЫЯ ЭКСКУРСАВОДЫ»

## Святкаванне 65-й гадавіны Цэнтра культуры «Віцебск» абяцае стаць унікальнай падзеяй

**— Наш горад здаўна, задоўга да «Славянскага базару» славіўся фестывалямі, і мы вырашылі адрадзіць самыя цікавыя з іх, напрыклад, джазавы. Упэўнены, што не толькі віцебскі глядач гэта ацэніць, — расказаў генеральны дырэктар Цэнтра культуры «Віцебск», кіраўнік дырэкцыі міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», прэзідэнт Сусветнай асацыяцыі фестываляў (WAF) Аляксандр СІДАРЭНКА.**

Свята ў гонар юбілею стартуе 28 студзеня выставай-прэзентацыяй творчых калектываў, філіялаў цэнтра і канцэртам-прысвячэннем. Усё гэта пройдзе ў канцэртнай зале «Віцебск». Аднак юбілейнай даце будуць прысвечаны розныя праекты на працягу ўсяго бягучага года. Цэнтру ёсць чым ганарыцца. Тут цікава праводзяць вольны час людзі любога ўзросту і роду заняткаў, дзейнічаюць каля 35 творчых калектываў, больш чым палова з іх маюць ганаровыя званні.

— На святкаванні яны ўсе выступяць. Для гэтага спецыяльна будуць працаваць творчыя пляцоўкі. На іх адначасова будуць паказваць сваё майстэрства як пачаткоўцы, так і вопытныя ўдзельнікі. Каб госці свята лепш даведаліся пра гісторыю Цэнтра культуры «Віцебск», стварэнне ансамбляў і іншае, будуць арганізаваныя спецыяльныя экскурсіі. Такога ў краіне яшчэ не было, — заінтрыгавала **Марына РАМАНОЎСКАЯ, намеснік генеральнага дырэктара па спецыяльных праектах.**

У гонар свята гаспадары ўстановы прапанавалі гараджанам і гасцям горада скарыстацца паслугамі цэнтра са скідкамі ў памеры 50%. А карыстанне інтэрнэтам 28 студзеня тут будзе наогул бясплатнае.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

■ Добрыя памкненні

# Кола мецэнатаў пашыраецца

## Вартай аддзякай за матэрыяльную дапамогу можа быць духоўная

**Сёння выказванне ўдзячнасці тым, хто фінансава дапамагае сферы беларускай культуры, — ужо традыцыя. Гісторыя яе даволі маладая: пачаткам стаў 2012 год, калі ўпершыню так званыя мецэнаты атрымалі ўзнагароды ад Міністэрства культуры, што між радкоў азначала: сфера культуры вас шануе, дзяржава цэніць ваш уклад, а краіна вас не забудзе. Як пацвярджэнне гэтаму — штогадовая цырымонія ўручэння ганаровых дыпломаў кіраўнікам і прадстаўнікам арганізацый, што аказалі культуры бязвыплатную дапамогу.**

Днямі гэтая ўрачыстасць адбылася ў рэспубліканскім драматычным тэатры імя Горкага. Больш за дзевяноста так званых фізічных і юрыдычных асоб атрымалі ў гэты вечар ганаровыя дыпломы. 50 мільярдаў рублёў, па словах **міністра культуры Барыса СВЯТЛОВА**, летась было выдаткавана з боку мецэнатаў.

«Тут сабраліся высакародныя людзі, якія добраахвотна зрабілі ў мінулым годзе ўсё для развіцця айчыннай культуры, — сказаў міністр са сцэны. — Хоць інстытуту мецэнацтва ўжо больш за дзве тысячы гадоў, у нашай дзяржаве яму ўсяго два дзесяцігоддзі. Але ў нас ужо скламіся пэўныя традыцыі, у тым ліку ўрачыстае ўшанаванне і падзяка ў адрас айчынных мецэнатаў».

Калі разглядаць грошы ў больш практычным увасабленні, то можна сказаць, што «Славянскі базар у Віцебску», тэатральны форум «ТэАрт», кінафестываль «Лістапад», мерапрыемствы Нацыянальнага мастацкага музея, Вялікага і Купалаўскага тэатраў, Цэнтра сучасных мастацтваў і іншых устаноў без дапамогі бізнесу маглі б не ажыццявіцца.

Спонсарская дапамога — гэта і закупка экспанатаў, і ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы пэўнай установы, і заснаванне стыпендый ці прэмій, аснашчэнне літаратурай, дапамога, зыходзячы са сваёй спецыялізацыі (дзяржаўнае аб'яднанне «Беларуская чыгунка» аказала бязвыплатныя паслугі па перавозцы ўдзельнікаў «Славянскага базару») і ўвогуле выдаткаванне грошай на патрэбы культурных устаноў.

Хоць агульная сума, якую сфера мастацтва атрымала ў 2015 годзе ад мецэнатаў, не змянілася, відаць, што з'яўляецца ўсё больш і больш ахвотнікаў укладваць у вечныя каштоўнасці. А гэта сапраўды варта ўшанавання.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*

# ПРАГА ХУТКАСЦІ І ТРАФІКА

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Больш за тое, спецыяліст упэўнены, што тэхналогіі фіксаванага доступу ў інтэрнэт атрымаюць дадатковы імпульс для развіцця. Такая тэндэнцыя назіраецца на тэлекамунікацыйным рынку ўжо цяпер, што выразна відаць на прыкладзе развіцця тэхналогіі Ethernet.

## ПУБЛІЧНЫ WI-FI Ў АБМЕН НА НУМАР ТЭЛЕФОНА?

Паводле інфармацыі **камерцыйнага дырэктара «Атлант Тэлекам» Антона БЛАДЗІКА**, кампанія ў 2016 годзе плануе пашырыць сетку пунктаў доступу да грамадскага Wi-Fi. Як вядома, з 1 студзеня 2016 года ўступіла ў сілу пастанова Міністэрства сувязі і інфарматызацыі, якая наклала на беларускіх інтэрнэт-аператараў дадатковыя абавязацельствы па зборы і захоўванні даных аб карыстальніках на працягу года. У сувязі з гэтым перад уладальнікамі кропак доступу публічнага Wi-Fi паўстала пытанне арганізацыі сваёй працы ў адпаведнасці з нормамі заканадаўства. Пашырэнню таксама паслужыць пагадненне правайдара з Беларусбанкам аб стварэнні каля 200 кропак грамадскага доступу ў інтэрнэт, якое падпісалі яшчэ летась. Дарэчы, ужо сёння кампанія прапануе амаль 100 такіх кропак у Мінску і абласных цэнтрах. Разам з тым перад правайдарамі сёння ўзнікаюць новыя пытанні ў сувязі з гэтым. Згодна з заканадаўствам, гандлёвы або іншы аб'ект, які прадастаўляе паслугі доступу Wi-Fi, абавязаны ідэнтыфікаваць карыстальніка. Для гэтага ёсць два варыянты: перапісаць пашпартныя даныя або атрымаць нумар тэлефона. Як паказвае практыка — першы варыянт нязручны для кліента. Таму аператары вядуць працу над прадуктам, які дазваляе ідэнтыфікаваць карыстальніка па нумары тэлефона. Такі падыход адпавядае як інтарэсам абанента, так і патрабаванням нашага заканадаўства.

## КАМЕРЫ З'ЯВЯЦЦА НАВАТ У ЖЫЛЫХ ДАМАХ

З развіццём публічнага Wi-Fi і воблачных тэхналогій сёлета ў жылых дамах сталіцы будуць з'яўляцца сістэмы відэаманіторынгу, якія дазваляюць атрымліваць доступ да камер і відэазапісаў дыстанцыйна з дапамогай любой прылады, падключанай да інтэрнэту. Адпаведныя дамовы з таварыствамі ўласнікаў плануецца заключыць у гэтым годзе. Як патлумачыў Антон Бладзік, галоўная перавага воблачнага відэаманіторынгу перад класічным відэаназіраннем заключаецца ў таннасці, прастаце ўстаноўкі і эксплуатацыі. Акрамя таго, гэтая сістэма больш надзейная з пункту гледжання захоўвання інфармацыі.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

# НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ГРОШЫ НА ДЗІЦЯ

З 1 лютага вырастуць дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў

**Гэтыя дапамогі пераглядаюцца раз на тры месяцы. Іх памер залежыць ад памеру сярэднямесячнай зарплаты за папярэдні квартал.**

Памер штомесячнай дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў на першае дзіця складае 35% сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў рэспублікі і з 1 лютага будзе раўняцца 2 450 500 рублёў (у папярэднім квартале — 2 433 700 рублёў). На другое і наступных дзяцей памер штомесячнай дапамогі складае 40% сярэднямесячнай зарплаты, або 2 800 500 рублёў (раней — 2 781 400 рублёў). На дзіця-інваліда ва ўзросце да 3 гадоў дапамога выплачваецца ў памеры 45% сярэднямесячнай заработнай платы незалежна ад чарговасці нараджэння гэтага дзіцяці ў сям'і. З лютага гэта будзе 3 150 600 рублёў (цяпер — 3 129 100 рублёў).

Новыя памеры дапамог будуць дзейнічаць з 1 лютага па 30 красавіка 2016 года.

**Святлана БУСЬКО**. *busko@zviazda.by*

## ГРЫП: АДЗІНКАВЫЯ ВЫПАДКІ

**Захваральнасць на грып сёлета ў нашай краіне пакуль ніжэйшая за мінулагоднюю. Ніякай пазаштатнай сітуацыі з гэтым захворваннем няма. Выпадкі грыпу H1N1 адзінкавыя.**

Паводле слоў намесніка міністра аховы здароўя — галоўнага дзяржаўнага санітарнага ўрача Рэспублікі Беларусь Ігара ГАЕЎСКАГА, сёння ва ўсіх хворых, каму праводзілася лабараторная дыягностыка, пераважаюць адэнавірусы. Амаль у кожнага трэцяга — РС-вірусы, у 10 працэнтаў — парагрып і адзінкавыя выпадкі H1N1. Апошнія выяўляюцца якраз у тых, хто не палічыў неабходным прышчапіцца (якраз ад гэтага тыпу віруса і праводзілася ўвосень вакцынацыя). Урачэбную дапамогу атрымліваюць усе, хто звяртаецца, аптэчная сетка працуе без перабояў.

**Святлана БЕРАСЦЯНКА.** *protas@zviazda.by*

## ЗОЛАТА БУДУЧАГА ЧЭМПІЯНАТУ

Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне памятныя манеты «Чэмпіянат свету па біятлоне 2016 года. Осла»

**Такім чынам, фінансавы рэгулятар краіны з 26 студзеня пачынае продаж названых памятных манет у трох варыянтах.**

Залатая манета, прысвечаная біятлону, мае намінал 20 рублёў, масу 3,11 грама і дыяметр 16,25 мм. Мае пробу сплаву 999 і выпушчана тыражом 500 штук. Сярэбраная манета мае таксама намінал 20 рублёў, але масу — ужо 33,62 грама і дыяметр 38,61 мм. Яе проба сплаву 925 і тыраж 2000 штук. Медна-нікелевая манета значна таннейшая. Яе намінал 1 рубель, маса 15,5 грама, дыяметр 33 мм і тыраж 2000 штук.

Прэс-служба Нацбанка адзначае, што манеты маюць форму круга, з пярэдняга і адваротнага бакоў — выпуклы кант па акружнасці. Бакавая паверхня манет з насечкай.

На пярэднім баку манет — рэльефны малюнак Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, пад гербам — у выглядзе стылізаванага арнаменту — фрагменты выявы спартыўнага інвентару біятланістаў. На адваротным баку — выява ў профіль біятланісткі, якая рыхтуецца да стрэлу. Манеты адчаканены ў таварыстве «Літоўскі манетны двор» якасцю: залатыя і сярэбраныя — «пруф», медна-нікелевыя — «пруф-лайк». Выпушчаныя ў абарачэнне манеты з'яўляюцца законным плацежным сродкам Рэспублікі Беларусь, абавязковым да прыёму па намінальным кошце пры ўсіх відах плацяжоў без усялякіх абмежаванняў. Асобна нагадаю, што сённяшні намінальны кошт гэтых манет застанецца нязменным і пасля 1 ліпеня, калі запланавана дэнамінацыя нацыянальнай грашовай адзінкі.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## АДНАВІЛІ НА ПРАЦЫ

Абласны камітэт прафсаюзаў дапамог работніку адстаяць свае правы ў судзе

**Канфлікт адбыўся на фоне незаконнага звальнення майстра шклоўскага жылкамгаса. Наймальнік не пажадаў працягваць з ім кантракт. Мужчына звярнуўся ў Магілёўскі абкам прафсаюзаў работнікаў мясцовай прамысловасці і камунальна-бытавых прадпрыемстваў з просьбай дапамагчы разабрацца ў складанай сітуацыі. На месца выехаў спецыяліст, і хутка высветлілася, што наймальнік праігнараваў адразу некалькі нормаў рэспубліканскага і абласнога галіновых пагадненняў.**

Па-першае, быў парушаны тэрмін папярэджання работніка аб звальненні. Па-другое, наймальнік пакінуў без увагі такую норму закона, як неабходнасць падоўжыць кантракт з работнікам, які болей за 5 гадоў працаваў на прадпрыемстве і не меў дысцыплінарных пакаранняў. Да таго ж майстар жылкамгаса пазалетась стаў членам прафкама, і па законе з ім трэба было падоўжыць кантракт на ўвесь перыяд паўнамоцтваў прафкама прадпрыемства — да верасня 2019 года.

Прававы інспектар працы накіраваў наймальніку рэкамендацыю з указаннем недапушчальнасці парушэння працоўнага заканадаўства. Але яна была праігнараваная, і работнік звольнены. У пошуках справядлівасці той звярнуўся ў суд. У абкаме прафсаюзаў яму дапамаглі скласці заяву з просьбай аднавіць яго на працы, спагнаць з наймальніка сярэдні заробак за час вымушанага прагулу, а таксама кампенсаваць маральную шкоду. Суд задаволіў усе гэтыя патрабаванні. Наймальнік паспрабаваў аспрэчыць рашэнне раённага суда, але калегія абласнога суда прызнала яго законным і абгрунтаваным.

— Працоўны калектыў прадпрыемства на справе пераканаўся ў тым, што прафсаюз рэальна можа абараніць яго інтарэсы, — падкрэсліў намеснік старшыні абкама прафсаюза работнікаў мясцовай прамысловасці і камунальна-бытавых прадпрыемстваў Павел Жуйкоў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

## НАПІШЫ ЛІСТ САБЕ ДАРОСЛАМУ

**У Беларусі стартуе рэспубліканскі маладзёжны конкурс сачыненняў эпісталярнага жанру. Яго ініцыятарам выступае РУП «Белпошта»**

Ідэя конкурсу заключаецца ў тым, каб абудзіць у падлеткаў жаданне пісаць лісты, развіць у падрастаючага пакалення здольнасць фармуляваць і выказваць свае думкі, перадаючы ўсе іх адценні... У конкурсе могуць удзельнічаць навучэнцы ва ўзросце да 15 гадоў. У 2016 годзе для конкурсу прапануецца наступная тэма: «Напішы ліст самому сабе 45-гадоваму».

На першым этапе (з 1 лютага па 1 сакавіка) адбор твораў будзе праводзіцца камісіяй на ўзроўні раёна (горада), а далей — на ўзроўні абласцей. У склад камісіі ўваходзяць прадстаўнікі ад Міністэрства адукацыі і РУП «Белпошта». Падвядзенне вынікаў нацыянальнага конкурсу адбудзецца ў першай палове красавіка.

Сачыненне, якое зойме першае месца, будзе накіравана ў штаб-кватэру Міжнароднага бюро Сусветнага паштовага саюза (г. Берн, Швейцарыя) для ўдзелу ў 45-м міжнародным маладзёжным конкурсе сачыненняў эпісталярнага жанру і апублікавана ў СМІ.

Больш падрабязную інфармацыю можна знайсці на партале Міністэрства адукацыі ў раздзеле «Выхаванне і моладзь».

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## НЕЛЕГАЛЬНА, ОПТАМ І Ў РОЗНІЦУ

**Лідскія праваахоўнікі спынілі нелегальны бізнес па перапродажу безакцызнага алкаголю з крамаў duty free.**




Сапраўдны склад безакцызных лікёра-гарэлачных вырабаў (573 бутэлькі агульным аб'ёмам каля 350 літраў) супрацоўнікі Лідскага пагранатрада, падатковай інспекцыі і міліцыі выявілі ў вёсцы Геранёны Іўеўскага раёна па месцы жыхарства адной беларускай грамадзянкі. Устаноўлена, што па яе заказе і іншаземцы, і беларусы набывалі гэты тавар у крамах бяспошліннага гандлю на літоўскай мяжы і перамяшчалі ў Беларусь. Такім няхітрым спосабам прадукцыю накоплівалі і ў далейшым нелегальна рэалізоўвалі на тэрыторыі нашай краіны — оптам і ў розніцу. Паводле інфармацыі прэс-службы Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі, партыю алкаголю коштам 55,5 мільёна рублёў канфіскавалі, а матэрыялы справы перадалі ў суд.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

## «АДЗНАЧЫЛІ» ПЕРШУЮ СЕСІЮ

**Супрацоўнікі сталічнага АМАПа затрымалі трох хлопцаў, двое з якіх дэманстравалі аголеныя часткі свайго цела, а трэці здымаў гэта на камеру мабільнага тэлефона.**

Здарэнне адбылося на Кастрычніцкай плошчы. Хуліганамі-эксгібіцыяністамі аказаліся маладыя людзі 20-ці і 19-ці гадоў, а «аператарам» — іх 17-гадовы таварыш. Высветлілася, што такім незвычайным спосабам хлопцы, студэнты адной са сталічных ВНУ, адзначалі... сваю першую сесію. Два «акцёры» былі нападпітку. Кампанію даставілі ў Цэнтральнае РУУС г. Мінска, дзе на іх склалі адміністрацыйныя пратаколы за хуліганства.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Агітацыя і крэатыў

# У «ЗОРНЫ ПАХОД»... ПА АБІТУРЫЕНТАЎ

**Учора ад сцен Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта стартаваў 51-ы «Зорны паход» студэнтаў і выкладчыкаў па месцах баявой і працоўнай славы беларускага народа, прысвечаны Году культуры.**

Удзел у ім возьмуць 7 зводных атрадаў агульнай колькасцю больш за 200 чалавек, якія пройдуць па тэрыторыях Маладзечанскага, Барысаўскага, Пухавіцкага, Браслаўскага, Асіповіцкага, Столінскага і Старадарожскага раёнаў. Дэвіз паходу — «БДПУ: будучыня пачынаецца тут!» Галоўная мэта — агітацыя за педагагічную прафесію.

Студэнты факультэта псіхалогіі («Новы погляд») збіраюцца здзіўляць школьнікаў Браслаўскага раёна новым поглядам на звыклыя рэчы і сітуацыі, прапанаваўшы ім шырокую праграму трэнінгаў рознай накіраванасці. На ўдзельнікаў атрада «Ёсць кантакт» факультэтаў пачатковай адукацыі і фізічнага выхавання ўскладзена ганаровая місія па наладжванні сяброўскіх кантактаў з навучэнцамі і жыхарамі Асіповіцкага краю.

Студэнты і выкладчыкі факультэтаў спецыяльнай адукацыі і эстэтычнай адукацыі будуць арганізоўваць зорныя фэсты на канцэртных пляцоўках Барысаўскага раёна. У склад каманды ўваходзяць члены народнага ансамбля беларускай музыкі і песні «Ярыца».

Удзельнікаў атрада «Дзеці Эйнштэйна» (фізіка-матэматычны факультэт) чакае падарожжа ў Столінскі раён. Яны гатовыя памнажаць найлепшыя традыцыі гумару і крэатыву, тым больш што з імі адпраўляюцца і члены зборнай каманды КВЗ «Лепшыя сябры» (удзельнікі вышэйшай тэлевізійнай лігі 2015 і 2016 гадоў) на чале з яе капітанам.

Жыхароў Старадарожскага раёна чакаюць сюрпрызы ад «Студэнцкага батальёна» факультэтаў прыродазнаўства і філалагічнага: у іх праграме самыя розныя нумары — ад цыркавых фокусаў і клаўнады да высокага сцэнічнага майстэрства ад удзельнікаў народнага літаратурнага тэатра «Жывое слова».

У Маладзечанскім раёне атрад «Маладая гвардыя» гістарычнага факультэта і факультэта сацыяльна-педагагічных тэхналогій збіраецца правесці лекцыі па «белых плямах» гісторыі, заняцца краязнаўчай работай, а таксама паказаць і ўкараніць у работу ўстаноў адукацыі свае методыкі ў галіне сацыяльнай працы і сацыяльнай педагогікі.

Ідэя правядзення «Зорных паходаў» нарадзілася ў 1966 годзе, калі студэнты Мінскага педагагічнага інстытута (так называўся БДПУ імя Максіма Танка да 1993 года) узялі ўдзел ва Усесаюзным паходзе моладзі па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа. Стартавалі атрады ў розных населеных пунктах, а фінішавалі адначасова ў адным месцы. Схема такога маршруту на карце па форме падобная да зоркі, адсюль і назва паходу — «Зорны».

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

MEN'S EHF EURO 2016 POLAND

# ГУЛЯЦЬ СУПРАЦЬ УСІХ

**Пасля першага паядынку асноўнага раўнда кантынентальнага першынства ў Польшчы ў нашых хлопцаў настала трохдзённая паўза. Гэты перапынак яны запоўнілі трэніроўкамі і культурна-гістарычнай праграмай. Напярэдадні разам са старшынёй федэрацыі гандбола Беларусі і трэнерскім штабам гульцы адправіліся на экскурсію ў канцэнтрацыйны лагер і лагер смерці Асвенцым.**



Тым часам спецыялісты і заўзятары думалі, ці пойдзе такая працяглая паўза на карысць падапечным Юрыя Шаўцова, бо наперадзе важны паядынак з палякамі. Гаспадары на сваёй пляцоўцы, на вачах у перапоўненай арэны ў Кракаве, проста не маглі спатыкнуцца, але і нашым хлопцам адступаць ужо няма куды. Бронзавыя прызёры леташняга чэмпіянату свету ўпэўнена пачалі выступленне на Еўра-2016 у групе, а ўжо ў асноўным раўндзе эфектна абгулялі не менш знакамітых французаў, таму яшчэ да стартавага свістка было зразумела, што матч для беларусаў будзе такім жа складаным, як і папярэдні. У складзе палякаў мы не ўбачылі «зорак» Гжэгажа Ткачыка, Барталамея Яшкі і Марыюша Юркевіча, але ў страі славутыя Караль Бялецкі і Славамір Шмаль. У нас матч з прычыны хваробы прапускаў Максім Бабічаў.

Гульня пачалася паспяховай атакай беларусаў, але ўжо на другой хвіліне сустрэчы каманду Шаўцова чакала першае расчараванне — траўму атрымаў Сяргей Рутэнка. Капітан пакінуў пляцоўку толькі з дапамогай медыкаў і працягваў назіраць за ходам матча ўжо з лаўкі запасных. Да сярэдзіны першага тайма гаспадары пачалі сыходзіць у адрыў, а да перапынку і зусім нарошчваць сваю перавагу. Тут і нерэалізаваныя атакі нашых хлопцаў, і правалы ў абароне, і не такая ўпэўненая, як раней, гульня ў варотах Вячаслава Салдаценкі. На другі тайм падапечныя Юрыя Шаўцова выходзілі, саступаючы ўжо 6 мячоў. Здаецца, змяніць ход сустрэчы было ўжо немагчыма: палякі, якіх падганялі перапоўненыя трыбуны, дазволілі скараціць адрыў толькі ў адзін мяч — 32:27. Другое запар паражэнне беларусаў, а гэта значыць — па-ранейшаму нуль ачкоў і апошняе месца ў выніковай табліцы.

*— Траўма Сяргея Рутэнкі, вядома, ускладніла сітуацыю; не пайшла гульня ў варатароў, але каманда змагалася. Я мяняў вопытных гульцоў на маладых, і другі тайм склаўся больш удала, з улікам таго, што ў нас у асноўным дзейнічала моладзь. У прынцыпе, я задаволены тым, як хлопцы праявілі сябе, аднак яны па-ранейшаму дапускаюць шмат памылак, за што такая каманда, як зборная Польшчы, нас адразу ж карала,* — адзначыў **галоўны трэнер беларусаў Юрый ШАЎЦОЎ пасля завяршэння сустрэчы.**

Заўтра наша зборная правядзе заключны матч на чэмпіянаце з камандай Македоніі. Нагадаем: пасля асноўнага раўнда, які завершыцца 27 студзеня, па дзве найлепшыя зборныя з дзвюх шасцёрак выйдуць у паўфінал. Паўфінальныя сустрэчы адбудуцца 29 студзеня, фінальны паядынак і матч за «бронзу» пройдуць 31 студзеня ў Кракаве.

Чэмпіён Еўропы атрымае прамую пуцёўку на Алімпійскія гульні-2016 у Рыа-дэ-Жанейра. У выпадку перамогі зборнай Францыі, якая ўжо кваліфікавалася на Алімпіяду як чэмпіён свету, алімпійскі пропуск заваюе фіналіст кантынентальнага форуму. Акрамя таго, дзве каманды атрымаюць магчымасць згуляць на перадалімпійскім кваліфікацыйным турніры. Каб трапіць у лік удзельнікаў кваліфікацыі, трэба заняць лепшыя выніковыя месцы сярод камандаў, якія яшчэ не атрымалі на гэта права. Зборныя Германіі, Даніі, Іспаніі, Польшчы, Славеніі і Харватыі ўжо забяспечылі сабе месца ў кваліфікацыі Гульняў-2016.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

Белинвестбанк

ИНФОРМИРУЕТ

По договорам текущего (расчетного) банковского счета в белорусских рублях (для зачисления пенсий), заключенным до 01.02.2016 года, с 04.02.2016 года устанавливается следующий размер процентной ставки:

| Вид договора | Валюта договора | Размер процентной ставки (годовых) |
|---|---|---|
| Договор текущего (расчетного) счета (для зачисления пенсий) | BYR | 3,0% |

146

www.belinvestbank.by

Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29. УНП 807000028. Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь №3 от 03.06.2013 г.